4. Санько, С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастнай культуралёгіі / С. Санько. – Мінск: БГАЦ, 1998. – 190 с.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена анализу востребованности современным обществом календарно-обрядовых праздников как одной из культурно-исторических особенностей народа и поиску путей по их актуализации и внедрению в современную художественную жизнь. Анализируется современная ситуация трансформации календарно-обрядового творчества в любительских фольклорных коллективах в результате урбанизации, высказывается мысль о неизбежности переосмысления и переакцентировки функционального содержания современных праздников. Обращается внимание на значимость возрождения таких ярких проявлений народного творчества, как календарно-обрядовые праздники, сохранение и развитие которых автор пропагандирует собственной культурно-просветительской деятельностью и предлагает свои методические рекомендации в этом направлении.

SUMMARY

The article is devoted to the analysis of the demand of modern society for calendar and ritual holidays as one of the cultural and historical features of the people and the search for ways of their actualization and implementation in modern artistic life. The main part of the article is devoted to the analysis of the current situation of transformation of calendar and ritual creativity in amateur folklore groups as a result of urbanization and suggests the inevitability of rethinking and reevaluating the functional content of modern holidays. The author focuses on the importance of the revival manifestations such as folk calendar holidays, the preservation and development of which the author promotes their own cultural and educational activities and offers guidelines in that direction.

***Рабец Т. Д.***

## ІДЭЙНА-ТЭМАТЫЧНЫЯ І МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ ФАЛЬКЛОРУ САЛДАТ ТЭРМІНОВАЙ ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*
*(Пастуліў у рэдакцыю 16.09.2019)*

Доўгі час фальклор салдат тэрміновай ваеннай службы не быў прадметам спецыяльнага даследавання не толькі беларускіх, але і рускіх фалькларыстаў. Нягледзячы на тое, што субкультура салдат тэрміновай службы пачала фарміравацца яшчэ ў 60-я гады ХХ ст., толькі ў 1990-х гадах у салдацкай вуснай і пісьмовай творчасці даследчыкамі былі выяўлены тыповыя рысы, якія дазволілі далучыць гэты пласт народнай творчасці да ліку жанраў традыцыйнага фальклору. Шырока распаўсюджаныя клішэ, формулы, традыцыйныя тэксты пераходзілі са сшытка ў сшытак па класічных законах бытавання фальклорных твораў, у сувязі з чым большасць твораў салдацкага фальклору захавала менавіта пісьмовую форму бытавання і высокую ступень паўтаральнасці. Акрамя таго, перыяд фарміравання і развіцця дадзенай сістэмы жанраў фальклору прыпадае на час існавання Узброеных сіл СССР, таму на тэрыторыі Беларусі амаль увесь салдацкі фальклор быў зафіксаны менавіта на рускай мове.

Сістэму жанраў салдацкага фальклору складаюць творы невялікага памеру, вельмі ёмістыя па форме і ў большасці выпадкаў гумарыстычныя або

лірычныя па змесце. Гэта шматлікія афарызмы, анекдоты, лірычныя мініяцюры, песні рознай тэматыкі (каханне, сяброўства, вайна, мужнасць і патрыятызм і інш.), «маразмы», цытаты з мастацкай літаратуры і філасофскіх твораў, тэксты любімых песень і г. д.

Асноўнымі формамі бытавання фальклору салдат тэрміновай службы з'яўляюцца «дэмбельскі альбом» і «салдацкі блакнот», якія маюць традыцыйную структуру і могуць успрымацца ў якасці самастойнага жанру сучаснага пісьмовага фальклору. Прызначэнне кожнай з гэтых форм адрозніваецца: калі блакнот заводзіўся салдатамі амаль з першага дня службы і з'яўляўся своеасаблівым акумулятарам салдацкай традыцыі, то альбом ствараўся перад звальненнем як памяць пра службу ў арміі і выступаў у якасці своеасаблівага дзённіка, які адлюстроўваў усе этапы службы салдата.

Змест тыповага салдацкага блакнота, як правіла, складаецца з дзвюх частак: звычайныя запісы, якія маюць як інфармацыю ўтылітарнага прызначэння – адрасы, даты дзён нараджэнняў сяброў і іншае, так і ўласна салдацкі пісьмовы фальклор. Тэкставую частку салдацкага блакнота ў родавых адносінах складаюць як лірычныя, так і эпічныя формы. Увесь прадстаўлены ў блакноце матэрыял можна падзяліць на чатыры асноўныя тэмы:

1) лірыка пра чаканне салдатамі дэмбеля;
2) любоўная лірыка;
3) лірыка, прысвечаныя маці і роднай хаце;
4) гераічныя лірыка.

Колькасна пераважае менавіта любоўная лірыка. Лірычныя тэксты ўяўляюць сабой тэматычнае адзінства: яны, як правіла, адлюстроўваюць мары і перажыванні салдата. У лірычных вершах салдат выказвае свае надзеі, неспакой і смутак па каханай дзяўчыне, якая засталася чакаць яго з арміі. На першы план у гэтых творах выступае ўстойлівы стэрэатыпны вобраз нявернай дзяўчыны:

*Зачем клянётесь вы, когда мы уезжаем?*
*Зачем клянётесь непременно ждать?*
*Ведь каждая из вас прекрасно знает,*
*Что нас дождётся только мать* [1, с. 79].

Праз дадзены вобраз адлюстроўваюцца трывога і рэўнасць маладога чалавека, надоўга разлучанага са сваёй каханай. Найбольш поўна гэтыя пачуцці перадаюцца ў так званых «апошніх лістах» да здрадніцы, якія звычайна пачыналіся радкамі: *«Пишу письмо последний раз, ответа я не жду от вас»* (уласны запіс). Само пасланне нярэдка характарызуецца надзвычайнай грубасцю. Часам адрасант жадае здрадніцы сустрэць у жыцці такога нягодніка, ад якога яна нацерпіцца шмат здзекаў і прыніжэнняў і нарэшце зразумее, якога добрага хлопца яна не дачакалася з арміі. І хоць салдату няма за што прасіць у дзяўчыны прабачэння, нярэдка ў такіх вершах сустракаецца фраза: *«Уж если так, то ты прости»* (уласны запіс).

Шырока распаўсюджаныя сюжэты вершаў пра няверную дзяўчыну не з'яўляюцца фактам біяграфіі іх складальнікаў, а ўяўляюць сабой адзін са стэрэатыпаў, звязаных з устойлівым тыповым вобразам салдата. У блакнотах салдат, якія служылі ў месцах баявых дзеянняў, напрыклад, у Чачні або Афганістане, дадзены стэрэатып набывае ярка выражаны трагічны характар, калі гаворыцца пра тое, як салдат гіне з-за таго, што яму здрадзіла дзяўчына. Страта кахання прыраўноўваецца да страты сэнсу жыцця.

Вобразу здрадніцы ў салдацкіх блакнотах супрацьпастаўлены не менш стэрэатыпны вобраз вернай дзяўчыны, якая чакае каханага з арміі. Ёй прысвячаюцца самыя пяшчотныя вершы, дзе гучаць словы пра каханне, заспакаенне і абяцанне хутка вярнуцца на радзіму. Салдат просіць каханую набрацца цярплівасці і дачакацца яго. Самымі распаўсюджанымі сюжэтамі вершаў дадзенай тэматыкі з'яўляюцца тыя, якія пабудаваны ў выглядзе калыханкі для каханай або клятвы салдата быць верным дзяўчыне, нягледзячы ні на што:

*Усни, девчонка, спи спокойно,*
*Ведь где-то, стиснув автомат,*
*Тебя надёжно охраняет*
*И крепко любит твой солдат* (уласны запіс).

Нярэдка ў гэтых вершах нароўні з моцнай формай выражэння кахання гучаць ноткі гумару, самаіроніі і перабольшвання. Салдат прысягае сваёй каханай усім, што ў яго ёсць: кірзавымі ботамі, аўтаматам або іншымі рэчамі, якімі даводзіцца карыстацца ў паўсядзённым салдацкім жыцці, або ісці да загса страявым крокам для прыняцця прысягі «Вернасці адзін аднаму».

Варта адзначыць, што колькасць вершаў пра верную дзяўчыну значна пераважае колькасць вершаў пра дзяўчыну, якая здрадзіла свайму каханаму. Гэта гаворыць пра спецыфіку перажыванняў салдата: ён больш спадзяецца на шчаслівыя адносіны з каханай. У выражэнні сваіх пачуццяў, як правіла, ён стрыманы, не дазваляе сабе быць залішне сентыментальным. Часам пачуцці прыхаваны ў тэксце і патрабуюць расшыфроўкі (па прынцыпе акраверша).

Такім чынам, жаночыя вобразы, якія сустракаюцца ў песнях пра каханне, з'яўляюцца своеасаблівай аб'ектывацыяй унутраных перажыванняў салдата. Праз вобраз «здрадніцы» выражаюцца трывога, рэўнасць і боязь страты каханай. Вобраз «вернай дзяўчыны» адлюстроўвае надзеі, смутак па ёй, мары пра каханне, што становіцца галоўнай каштоўнасцю ў духоўным свеце салдата.

Нярэдка ў вершах салдат са смуткам разважае і пра тыя змены ў жыцці, якія адбываюцца з ім падчас службы ў арміі, або шкадуе пра гады юнацтва і маладосці, якія праходзяць міма, пакуль ён павінен служыць:

*Сурова жизнь, коль ты в шинели,*
*И юность перевязана ремнём.*
*Здесь очень долго тянутся недели,*
*И молодость проходит день за днём* (уласны запіс).

Салдацкая лірыка таксама прасякнута цяжкімі перажываннямі, звязанымі з адчуваннем несправядлівасці і абразлівасці ўнутрывайсковых

адносін. І калі мары пра вяртанне дадому і сустрэчу з каханай адлюстраваліся ў вобразе дзяўчыны, то эмоцыі, звязаныя з цяжарам службы, аб’ектываваліся ў вобразе своеасаблівага антаганіста – старэйшага па званні (сяржанта, старшыні, прапаршчыка, «дзядоў» і г. д.) – вечнай крыніцы пакут і цяжару салдацкага жыцця, бессардэчнага і бяздушнага ката, які прымушае працаваць да сёмага поту.

*Кто не был в учёбке, тому не понять,*
*Как хочется есть, как хочется спать,*
*Как хочется морду сержанту набить,*
*А после отбоя пузырь раздавить* (уласны запіс).

Нягледзячы на вялікую колькасць тэкстаў, прасякнутых смуткам і трагічнасцю, нельга сказаць, што салдат – гэта юнак, які не пасталеў, а толькі скардзіцца на сваё жыццё. Большая частка вершаў прасякнута гумарам, іроніяй і аптымізмам. Сапраўдны салдат не можа быць сентыментальным, а павінен з гонарам і гумарам успрымаць салдацкае жыццё, умець пасмяяцца з самога сябе і цяжкасцей службы.

Найбольш ярка адлюстравалася іронія ў распаўсюджаным у салдацкіх блакнотах жанры салдацкай малітвы. Салдаты з гумарам моляцца асаблівым вайсковым бажаствам – Дэмабілізацыі і Водпуску, просяць абароны ад вайсковых цяжкасцей і прыгнёту камадзіраў:

*Пресвятая мать Демобилизация,*
*Сохрани Раба Божьего:*
*От отбоя позднего,*
*От подъёма раннего,*
*От кросса дальнего,*
*От крика дневального,*
*От зарядки физической,*
*От тренажей химических,*
*От старшины беса,*
*От масла недовеса,*
*От утреннего развода,*
*От командира взвода* (уласны запіс).

Выразна праяўляецца ў салдацкіх блакнотах і іншая тэндэнцыя, супрацьлеглая гумарыстычнай, – стрыманая гераізацыя вобраза салдата як героя, які абараняе Радзіму і сваіх родных:

*Если трудно нам придётся,*
*Когда в тупик зажмёт судьба,*
*Железо, может, и согнётся,*
*А вот солдаты – никогда!* (уласны запіс).

Такім чынам, блакнотная лірыка раскрывае ўнутраны свет салдата як сапраўднага мужчыны, моцнага і мужнага, героя і абаронцы, вернага ў каханні і дружбе.

Эпічную форму тэкставай часткі салдацкага блакнота ў асноўным прадстаўляюць афарызмы – кароткія выслоўі, якія носяць характар аксіёмы. Нягледзячы на тое, што тэматыка афарызмаў такая ж, як і ў салдацкай

лірыцы, большая частка празаічных твораў прысвечана рэаліям вайсковага жыцця: *«Миру – мир, а солдату – дембель»*; *«Будь проклят тот день, когда хирург постучал по моей груди и сказал: “Годен”»*; *«Женщин не берут в армию потому, что армия не может быть из одних командиров»* [1, с. 89].

Да афарызмаў далучаюцца тэксты з моўнымі памылкамі, якія былі дапушчаны начальствам і зафіксаваны салдатамі: *«Кто такой, почему не вижу фамилии?»*; *«У вас что, языка нет в дверь постучаться?»*; *«Моя фамилия – майор Петров»*; *«Перед вами целый майор стоит!»* [1, с. 87].

Вобраз дзяўчыны таксама прадстаўлены ў празаічных жанрах, але калі ў лірыцы ў асноўным адлюстроўваюцца ўнутраныя перажыванні салдата, то ў прозе фармулююцца пэўныя агульныя законы, якія вызначаюць адносіны паміж мужчынам і жанчынай.

Такім чынам, лірычныя і празаічныя тэксты салдацкіх блакнотаў уяўляюць сабой ідэйна-тэматычнае адзінства, сканцэнтраванае вакол галоўнага вобраза – салдата. І калі лірыка галоўным чынам раскрывае свет пачуццяў і перажыванняў канкрэтнага чалавека, то проза прысвечана раскрыццю агульных законаў вайсковага і грамадзянскага жыцця.

Дэмбельскія альбомы ўяўляюць сабой фотаальбом вялікіх памераў, які запаўняецца фатаграфіямі, адрасамі калегаў, вершамі, афарызмамі, жартамі, малюнкамі-коміксамі з подпісамі і г. д. Абавязковым атрыбутам дэмбельскага альбома з’яўляецца інфармацыя пра ваенную акругу, нумары і месцы знаходжання часткі, гады службы салдата, яго сяброў.

Вокладку альбома традыцыйна абцягвалі аксамітам або кавалкам шыняля ці камуфляжу, упрыгожвалі шаўронамі, рознымі значкамі, нават ордэнамі, чаканкамі, зоркамі, гербамі, выдушанымі з ліставай медзі і латуні і адпаліраванымі да бляску. Старонкі альбома былі па-мастацку распыленымі фарбамі. Галоўным атрыбутам альбома з’яўляюцца калькі (пракладкі) паміж лістамі, якія ўяўляюць сабою малюнкі-коміксы. На гэтых малюнках у жартоўнай форме адлюстроўвалі ўсе вехі службы ўладальніка альбома.

Часта дэмбельскі альбом адкрываецца малюнкам цягніка, які заязджае ў кірзавы бот, што стаіць у варотах вайсковай часткі, дзе служыць уладальнік альбома. На апошняй старонцы – працяг малюнка: з разарванага бота выязджае вясёлы цягнік з надпісам «ДМБ». Далей ідзе ўрачысты сур’ёзны верш, напрыклад, такога тыпу:

*Открой блокнот, мой друг или подруга,*
*И пробегись глазами по строкам,*
*Они написаны в часы досуга,*
*В тоске по дому и родным местам.*
*Но если ты мужского пола,*
*И мук таких не испытал,*
*Закрой его и положи на место,*
*Не для тебя его писал!* (уласны запіс).

Тэматыка вершаў з’яўляецца аднолькавай для любых альбомаў. Адны і тыя ж творы хадзілі па руках з году ў год і былі запісаны ў салдацкіх блакнотах: пра жыццё, каханне, вернасць дзяўчыны, смешныя моманты з

жыцця салдатаў, філасофія, афарызмы, назіранні за армейскім жыццём і іншае. У альбомнай традыцыі таксама шырока прадстаўлены эпісталярныя (г. зн. злучаныя з прыватнай перапіскай) формы сучаснага пісьмовага фальклору, да якіх адносяцца вершаваныя віншаванні, пажаданні, клішэ і формулы (ці эпісталы) і вершаваныя подпісы да фотаздымкаў. Сустракаюцца нават урыўкі лістоў і цэлыя лісты:

*Время подходит, кончаю писать.*
*Сердце желает тебя увидать.*
*Возьмёшь, прочитаешь и вспомнишь меня…*
*Пока! До свиданья! Целую тебя!* (уласны запіс).

Подпісы да фотаздымкаў бываюць розныя, часта яны носяць інфарматыўны характар: удакладняецца месца і абставіны падзей, называецца чалавек, намаляваны на іх. Самую вялікую цікавасць выклікаюць менавіта дароўныя вершаваныя подпісы да фатаграфій «на памяць». Асноўныя тэмы такіх надпісаў – магчымае развітанне і памяць пра чалавека:

*Не смотри, какой я здесь.*
*Вспоминай, какой я есть* (уласны запіс).

З сярэдзіны 90-х гадоў XX ст. традыцыя дэмбельскіх альбомаў пачала пастунова адміраць. Аднак нельга сказаць, што яна знікла зусім. У цяперашні час у сродках масавай інфармацыі можна сустрэць аб'явы аб афармленні дэмбельскага альбома на заказ. Выраб дэмбельскага альбома залежыць ад роду войск і пажаданняў заказчыка. У такіх альбомах па-ранейшаму захоўваецца класічная вокладка, аздобленая армейскімі значкамі, фішкамі, металічнымі падвескамі, шпагатам і г. д. Альбом змяшчае дванаццаць старонак, на якіх плануецца размясціць 45 фотаздымкаў. Таксама прадугледжваецца месца для памятных запісаў, тэксту прысягі, прысутнічае канверт для дадатковых фотаздымкаў. Аднак фальклорныя тэксты ў такіх альбомах амаль адсутнічаюць.

Такім чынам, фальклор салдат тэрміновай службы з'яўляецца адным з важных элементаў культуры сучаснага грамадства, які патрабуе пільнай увагі фалькларыстаў. Дакладны, вобразны, заснаваны на простых, але, тым не менш, надзвычай ёмістых словах фальклор салдат тэрміновай службы ўнікальны. Празаічныя і лірычныя тэксты салдацкіх блакнотаў і дэмбельскіх альбомаў уяўляюць сабой ідэйна-тэматычнае адзінства, якое канцэнтруецца вакол салдата і раскрывае яго думкі, мары і пачуцці.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Современный городской фольклор : методические указания и иллюстративный материал по проведению фольклорной практики студентов I курса филологических факультетов / сост.: О. В. Приемко [и др.] ; под ред. О. В. Приемко. – Минск : БГУ, 2014. – 128 с.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена описанию жанрового состава фольклора солдат срочной военной службы. Выявляется общая специфика и основные формы современного бытования солдатского фольклора, раскрываются идейно-тематические и художественные

особенности текстов фольклора солдат, определяется степень сохранности отдельных его видов.

SUMMARY

The article is devoted to the description of the genre composition of folklore of soldiers of military service. The general specifics and basic forms of the modern life of soldier folklore are revealed, the ideological, thematic and artistic features of the soldier's folklore texts are revealed, the degree of preservation of its individual types is determined.

***Раюк А. Р.***

## СТАТУС БЕЛАРУСІ Ў СВЯДОМАСЦІ МЯСЦОВЫХ КАТАЛІЦКІХ ДВАРАН-КАНСЕРВАТАРАЎ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.09.2019)*

У часы Расійскай імперыі беларускія землі не складалі адміністрацыйнага цэлага, а былі падзелены на губерні (якія ў розныя часы ўваходзілі ў склад тых або іншых генерал-губернатарстваў), прычым без уліку ранейшага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Рэчы Паспалітай. Гэта як парушала ранейшыя фармальныя і нефармальныя сувязі ў грамадстве і вымушала адаптавацца, так і было выразнай праявай паніжэння фармальнага і нефармальнага статусу беларускіх зямель у імперыі.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. адносна літоўска-беларускіх губерняў згодна з афіцыйнай ідэалогіяй у імперскім справаводстве, публіцыстыцы і размоўнай гаворцы пачаў прымусова шырока выкарыстоўвацца тэрмін «Паўночна-Заходні край» («паўночна-заходнія губерні»), у які ўкладваўся сэнс паўночна-заходняй часткі «адзінай Русі» – «Паўночна-Заходняя Русь» («Паўночна-Заходняя Расія»).

Напрыклад, уласнік маёнтка Шостакі Слуцкага павета і новаахрышчаны з каталіцтва ў праваслаўе дваранін Канстанцін Ксаверыевіч Вайніловіч у 1868 г. у афіцыйным звароце да мінскага губернатара Касінава, напісаным уласнаручна, выкарыстаў наступную фразу: «Жадаючы карыстацца правам куплі маёнткаў у тутэйшым Паўночна-Заходнім краі, дарагой маёй радзіме, маю гонар турбаваць Ваша Правасхадзіцельства просьбай» [1, арк. 119]. З аднаго боку, у фразе выкарыстаны афіцыёзны канцылярызм («Паўночна-Заходні край»), а з другога – выказана любоў да роднага краю. У дакуменце словазлучэнне «дарагой маёй радзіме» падкрэслена алоўкам, што, верагодна, было зроблена чыноўнікам, які далучыў дакумент у канцылярскую справу. Дарэчы бацька Канстанціна дваранін-каталік Ксаверый Мікалаевіч Вайніловіч, паводле звестак Антона Луцкевіча, быў вялікім аматарам беларушчыны [2, с. 132].

Між тым, на фоне шырокага вывучэння палітычных, эканамічных, культурных і этнічных працэсаў гісторыі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. па-за ўвагай даследчыкаў засталася эвалюцыя фармальнага і нефармальнага статусу Беларусі ў практыцы і свядомасці дваран-кансерватараў (сярод якіх колькасна пераважалі каталікі), якія адыгрывалі